## СЕКЦИЯ 14
## ИСТОРИЧЕСКИЙ ОПЫТ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОГО И ПОЛИТИЧЕСКОГО РАЗВИТИЯ БЕЛАРУСИ

*Д. У. Карабіцкі*
Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук У. А. Падалінскі
БДЭУ (Мінск)

### ГІСТОРЫЯ КЛЯШТАРУ АЙЦОЎ МАРЫЯНАЎ У ДРУІ 1924–1938 гг.

Актуальнасць тэмы заключаецца ў акалічнасцях заснавання кляштару, яго мэце і ролі ў грамадска-палітычным жыцці тагачаснай Заходняй Беларусі. Друйскі кляштар айцоў марыянаў меў служыць духоўным патрэбам беларусаў каталікоў і працаваць дзеля аб'яднання Уніі ў адным Касцёле. Аднак да такой задумы варожа ставіліся польскія дзяржаўныя і духоўныя ўлады. Неразуменне першапачатковых мэтаў заснавання кляштару і падрыў дзейнасці беларускіх марыянаў прывялі да высялення і забароны дзейнасці як на тэрыторыі друйскай парафіі, так і на прымежных тэрыторыях «усходніх крэсаў» Польшчы.

Ордэн Айцоў Марыянаў – міжнародная манаская супольнасць, якая аб'ядноўвае святароў і братоў у апостальскай працы і супольным жыцці. Заснавальнікам Ордэна з'яўляецца Станіслаў Папчынскі.

На Беларусі Ордэн мае сваю больш чым 80-гадовую традыцыю, што распачалася ў 1924 г., калі Юрый Матулевіч, які быў рэфарматарам Ордэна, заснаваў кляштар марыянаў у Друі для беларусаў.

Беларуская нацыянальная свядомасць у друйскай парафіі да прыходу марыянаў была даволі развітай, што характарызавалася таксама і выкарыстаннем беларускай мовы падчас абвяшчэння казанняў на імшы, тэатральных пастановак, спеваў парафіяльнага хору на роднай мове. Так, на падставе дэкрэта віленскага біскупа 23 красавіка 1924 г. парафіяльны касцёл св. Троіцы і збудаванні былога бернардынскага кляштару былі перададзены а. Андрэю Цікоту з закону айцоў марыянаў.

У Друі была адкрыта польская гімназія, дзе навучалася вялікая колькасць дзяцей з ваколіцаў мястэчка. Але заключэнне паміж дзяржавай і касцёлам канкардату адразу абмежавала распаўсюджванне беларускай мовы на імшах і набажэнствах, а таксама дзейнасць святароў, якія імкнуліся да адраджэння беларускай нацыянальнай свядомасці.

Таксама змена ў кіраўніцтве Віленскай дыяцэзіі і памылковае разуменне мэты ўтварэння кляштару паспрыялі заняпаду ў далейшым беларускай нацыянальнай свядомасці сярод насельніцтва. Кіраўніцтва прытрымлівалася

палітыкі паланізацыі, а мэту ўтварэння кляштару бачыла ў падрыхтоўцы Друяй кадраў для працы сярод расійцаў. Так, пасля заканчэння навучання ў «Русікуме» (расійская калегія ў Рыме) і прыняцця візантыйскага абраду на працу сярод расійцаў у кітайскі горад Харбін былі накіраваны маладыя друйскія айцы і браты марыяне.

Усялякія спробы скампраметаваць марыянаў, падарваць іх дзейнасць атрымаліся. З-за беспадстаўнага абвінавачвання ў спробе атруціць святара цягам шматлікіх камісій была даказана невінаватасць айцоў марыянаў. Але вынікам усяго гэтага стала абмежаванне дзейнасці марыянаў. Так, было абмежавана да мінімуму ўжыванне беларускай мовы, а справа Уніі была ўзята пад строгі кантроль.

Такое беспадстаўнае і варожае стаўленне да ўсяго, што не з'яўляецца польскім, стала ў 1938 г. прычынай высялення беларускіх айцоў марыянаў з кляштару ў Друі.

Разгон друйскіх марыянаў выклікаў абурэнне і пратэсты не толькі беларусаў, беларускай прэсы, але і сярод польскіх дэмакратычных колаў. Друйскія марыяне паспрабавалі ўтварыць асобую правінцыйную адзінку, незалежную ад палякаў, але гэта не атрымалася. Польская нацыянальная палітыка была рашучай у змаганні з тэндэнцыямі беларусізацыі Касцёла.

Згодна з гэтай палітыкі выказаўся тагачасны браслаўскі стараста: «У Друі няма беларусаў, ёсць народ тутэйшы, з якога як з гліны можна зрабіць і палякаў і беларусаў... ідэал дзяржавы – гэта аднаалітая народнасць».

Па трапным вызначэнні а. Аляксандра Надсана: «Палякі ў Друі спраўлялі баль, быццам тыя пасажыры "Тытаніку" за хвіліну да таго, як карабель пацярпеў крушэнне і патануў».

**Спіс літаратуры**

1. *Надсан, А.* Біскуп Чэслаў Сіповіч: святар і беларус / А. Надсан. – Менск, 2004.
2. *Надсан, А.* Княгіня Радзівіл і справа адраджэння Уніі ў Беларусі / А. Надсан. – Менск, 2006.
3. *Надсан, А.* Pro patria aliena:Кляштар беларускіх айцоў марыянаў у Друі (1924–1938) / А. Надсан. – Менск, 2006.
4. *Туронак, Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. – Вільня, 2006.
5. *Górski, T.* Błogosławiony Jerzy Matulewicz / T. Górski. – Warszawa, 2005.
6. *Górski, T.* Proczek Z. Rozmiłowany w Kościele / T. Górski. – Warsawa, 1987.

*А. В. Молош*
Научный руководитель – кандидат исторических наук Т. В. Воронич
БГЭУ (Минск)

## РОЛЬ БЕЛОРУССКИХ ЗЕМЕЛЬ В ПОДГОТОВКЕ РОССИИ К ВОЙНЕ 1812 г.

Актуальность данной темы определяется заинтересованностью исследователей в изучении темы «Беларусь в войне 1812 г.». Интерес обусловлен грядущей 200-летней годовщиной русско-французской войны 1812 г.



БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by